# ЛОНДАН

**Максім Дасько**

**У тэксце змешчаны мультымедыя файлы (фотакарткі, аудыа), якія з'яўляюцца неад'емнай яго часткай. Усе файлы можна прайграваць (глядзець, слухаць)на веб-старонцы :* http://maximdosko.com/london *альбо запампаваць у выглядзе zip-архіву па спасылцы:* http://maximdosko.com/download/dosko-05-text1-london.zip

*Прысвечана малой Радзіме і патрыятызму(закрэслена) касмапалітызму.*

*Тэкст выконвае (чытае) галоўны герой.*

1.

1.1

Беларус из май хомлэнд, ит из зэ плейс вэрэ Ай воз борн. Оффициали ит из каллед зэ Рэпаблик оф Беларус, э соверижн индепендент стэйт виз итс овн говемент, конститушн, стэйт эмблем, флаг энд анзем. Беларус из ситуэйтед нерли ин зэ сэнтр оф Еуроп ин зэ вестерн парт оф зэ Ист-Еуропейн плэйн. Ит бордерс он Поланд ин зэ вест, он Литьюэниа энд Латвиа ин зэ норс-вест, он Рашша ин зэ норс энд ист, он Юкрэйн ин зэ саус. Ит хэз эн арэ оф ту хандрэд сэвн сквэа киломитрес энд э попьюлэйшн оф мо зэн тэн миллион. Беларус из э кантри оф рич хистори энд калча. Беларус сафферд грэйтли дурин Ворд Вар ту, ит лост мо зэн хэлф итс национал вэлс. Тудэй Беларашн индустри продюсес тракторс, биг лорриес, тэлевижн сэтс, байсикл энд элс. Агрокалча спешэлайзес ин милк энд мит продакшн, зэ мэйн калчес хэа ара потэйтос, флакс, грэйн, хэрбс энд вэджитэйблс. Беларус из э рэпаблик

оф вэл дэвэлопмент сайнс энд калча, эвэри эйт персон хэз хайгер эдукэйшн. Беларашнс нэйчрл синери из вайл, лонли плэйнс ковердвиз хилс, мэни лэйкс энд форэстс. Беларус из бьютифул энд Ай лав Беларус.

Ангельскай Гена не ведае, нешта са школы засталося, плюс у інтэрнэце выкарыстоўвае, але цалкам гэта можна назваць, што не ведае ён англійская. Сярэднестатыстычнаму звычайнаму бытавому чалавеку, тым больш сантэхніку ангельская не патрэбна і ў жыцці, хто ведае, ці калі-небудзь спатрэбіцца.

Лондон из зэ кэпитал оф Грейт Британ, итс политикал, экономик энд калчрэл сэнтр. Итс уан оф зэ ладжэст ситис ин зэ ворлд. Итс попьюлейшн из мо зэн миллион пипл. Лондон из ситуэйтэд он зэ рива Тэмз. Зэ сити из вери олд энд бьютифул. Ит воз фаундэд мо зэн ту саузанд еарс эго. Традишнли Лондон из дивайдэд инто сэверал патс: зэ Сити, зэ Вэст Энд, зэ Ист Энд энд Вэстминстэр. Зэ Сити из зэ олдэст пат оф Лондон, итс файнаншл энд бизнэс сэнтр. Зэ харт оф зэ Сити из зэ Сток Иксчеиндж. Вестминстер из зэ мост импотант пат оф зэ кэпитал. Итс зэ административ сэнтр. Зэ Хаус оф Парламент, зэ сит оф зэ Бритиш Гавомент, а зэа. Итс э вэри бьютифул билдинг виз ту тауэрс энд э вэри биг клок калледБиг Бэн. Биг Бэн из реали зэ белл вич страйкс эври куартер оф эн хауэр. Оппозит зэ Хаусэз оф Парламент из Вестминстер Абби. Итс э бьютифул гэаг билд овер наин хандред еарс эго. Букинхэм Плэйс из зэ оффициал рэзидэнс оф зэ Квин. Зэ Трафальгар Сквэа из зэ географикал сэнтр оф Лондон, ит воз нэймед ин мемори оф Адмирал Нельсон виктори ин зэ батл оф Трафальгар ин эйтин энд файв. Он зэ нос сайд оф Трафальгар Сквеа из зэ Нашнл Портрэит Галери. Нот фар эвэй из зэ Бритиш Мьюзием – зэ бигест мьюзием ин Лондон. Ит контэинс э прайслес коллекшн оф энциент манускриптс, коинс, скальпчерс эт сэтере, энд из элсо фэймос фо итс лайбрари.

Гена быў у Лондане. Мала хто са звычайных беларускіх сантэхнікаў быў ў Лондане. Гена быў...

З ангельскай у яго насамрэч было складана, нават, занадта.

1.2 *(Праекцыя фотаздымкаў, Гена ў яме; ; файл “ photo_001.jpg”.)*

Гена рамантуе водаправод. Старая чыгунная труба сотавага дыяметра (чугуняка сотка) лопнула недалёка ад шматпавярховага дома і вось ужо

два дні як падтоплівае падвал. Экскаватар вырыў яму амаль да трубы, далей трэба капаць акуратна лапатай уручную, каб каўшом экскаватара яшчэ больш не пашкодзіць трубаправод. Гена капае. Пасля ачысціць трубу ад бруду і будзе ставіць хамут. Хамут – гэта такі мантажны элемент з нержавейкі з гумавай пракладкай усярэдзіне і вінтамі, якія заціскаюцца збоку. Хамут ставяць, вінты заціскаюць шчыльна і труба яшчэ праслужыць доўга.

1.3

Гена працуе сантэхнікам у вёсцы Азярцо. Яна знаходзіцца каля двух кіламетраў ад МКАД (Мінская кальцавая аўтамабільная дарога) у брэсцкім накірунку і толькі афіцыйна называецца пакуль што вёскай, насамрэч гэта даволі вялікі пасёлак, дзе акрамя старой часткі ёсць катэджны кааператыў, шматкватэрныя двух-, пяці- і ўжо сяміпавярховыя дамы, плюс яшчэ вёска Багатырова сюды далучаецца. Гэта вялікая плошча абслугоўвання, тут тры глыбінныя свідравіны, вялізарная заблытаныя сетка водаправода, кацельня, дзве КПС (каналізацыйна-помпавая станцыя), адна з якіх новая, вялікая. Участак належыць раённаму Заслаўскай ЖКГ (жыллёва-камунальнай гаспадарцы).

У Азярцы у мясцовым ЖРЭУ (жыллёвае рамонтна-эксплуатацыйнае упраўленне) лічацца тры сантэхніка, двое з іх – тутэйшыя. Гена ездзіць на работу з Ракава, гэта аграгарадок у дваццаці пяці кіламетрах ад Мінска ў бок Гродна.

Калі казаць па-расейску – із Ракава, то тут нармальна, калі па-беларуску – з Ракава, таксама нічога, але вось калі, як амаль усе на трасянцы – с Ракава (сракава), то гучыць смешна, нецэнзурны каламбур такі.

Не вельмі зручна на работу ездзіць: гэта спачатку да Мінску даехаць, пасля па Мінску да Малінаўкі (раён Малінаўка) і тамака яшчэ да Азерца; карацей, недзе гадзіны паўтары атрымоўваецца. Неяк Гена жыў у Мінску, як раз у Малінаўцы, калі сям'я была, тады зручней, вядома, на работу было. Зараз сям'і няма, разбегліся сем гадоў таму, аліменты на сына плаціць. А Ракаў – гэта яго родны горад, тут бацькоўскі дом, зараз жыве з бацькамі. Гена даволі малады яшчэ – яму трыццаць чатыры гады.

Трыццаць чатыры гады, Ракаў, Мінск, Азярцо.

1.4.

Усё ж такі Гена быў у Лондане.

*(Праекцыя фотаздымкаў, магніцік на лядоўні; файл “photo_002.jpg”.)*

1.5.

Гена прачынаецца без пятнаццаці шэсць, устае, шпарка збіраецца. Аўтобус «Выгонічы-Мінск» у шэсць дваццаць восем з вакзала Ракава. Амаль заўсёды ўдаецца сесці і яшчэ паспаць, да Мінску трыццаць-сорак хвілін. У Мінску на Каменнай горцы сядае ў сто трыццаць восьмы аўтобус і едзе да Маліна ўкі яшчэ недзе з паўгадзіны, а тамака на прыпынку ў накірунку Азярца яго падбірае на Рено (Рено Сцэнік) Зміцер Леанідавіч – электрык у гадах з іх ЖРЭУ. Чамусьці была завядзёнка, што Гена ўвесь час садзіўся ззаду, не гледзячы, што электрык едзе адзін; яны вітаюцца і едуць моўчкі да Азярца, ехаць недалёка, хвілін дзесяць. Так катаецца на работу кожны дзень, акрамя выходных, святаў ці калі хварэе, і так ужо шэсць гадоў. Да гэтага з Малінаўкі ў Азярцо ездзіў.

Пераапранецца. Прайсціся павітацца з усімі ў канторы («на офісе»), на курылцы пастаяць (сам не паліць), перавесці дух, даведацца навіны, пазаляцацца з бухгалтаршамі, дыспетчарам, пахахміць. Часам з ранку работы няма, тады перакідваецца з мужыкамі ў карты альбо даміно; у даміно больш любіць, такая быццам больш інтэлектуальная гульня, чым «у дурня».Майстар аддае заяўкі і ідзеш выконваць дзе-што здарылася. У дзесяць-адзінаццаць у любым выпадку схадзіць на КПС адну і другую, прагледзіць усё лі нармальна, без засораў, ці не пераліваецца праз верх, ці помпы працуюць. На КПС Гена не любіць тырчаць, затрымлівацца, яно і зразумела – смярдзіць моцна, лайно (фекальныя масы) ж цячэ, не ландышамі пахне. А двое другіх сантэхнікаў, напарнікі Гены, наадварот часта тут бываюць. Таму што тут яны бухаюць; з ранку «вялікую» (нуль сем літра) віна возьмуць пасля яшчэ неаднаразова ў магазін зганяюць, і сядзяць, з вачэй схаваліся і быццам бы справа робіцца; шчыра кажучы можна сказаць, што яны алкашы, морды ўвесь час чырвоныя. А Гена

ўжо не п'е, пяць гадоў ні-ні, як кажуць, ні макавай расінкі. Самыя адказныя заданні – гэта Гене, «гэтыя алкашы зенкі пазаліваюць і не шурупяць ужо ніфіга». Адказныя заданні, гэта калі дзе трубу прарвала і прыязджае аварыйка з эвакуатарам, калі помпа на свідравіне стала і мяняць трэба, калі дзе кватэру затапіла альбо каналізацыя моцна забілася.

Гена галоўным чынам стараецца каб па вадзе заяўкі адразу апрацоўваць, а па гаўну, каналізацыі - тое алкашам скідваць. Вядома, бывае па-рознаму і з «каналюгай» час ад часу сутыкаешся.

Асноўныя праблемы па вадзе. Стала свідравіна, не пампуе помпа – праверыць, можа проста электрычнасць прапала ці па-новаму запусціць прыбор (частотны ператтваральнік, «частотнік»); альбо што не зразумела па прыбору, помпе – гэта да электрыка; помпа можа згарэць, тады памяняць яе. Прарыў – утварылася цеча, прарвала трубу і вада з зямлі б'е, цячэ, топіць недзе. У іх сістэме ціск не вялікі, да трох атмасфер, фантанам ніколі не б'е, проста падцякае. У кватэрах таксама можа працякаць ці кран сарвецца, альбо кран шуміць... Да гэтага часу дзе-нідзе калонкі на вуліцах засталіся, ну тыя, што з зямлі тырчаць і на ручку-рычаг трэба націскаць, хоць іх у сутнасці трэба адключаць, таму што гэтыя кубы не падлічыш, льецца без лічыльнікаў, дзеля пенсіянераў пакідаюць іх; так вось і калонку наладзіць трэба, а псуюцца яна пастаянна. Кацельню тутэйшую абслугоўваюць асобныя работнікі, але часам таксама памагчы трэба альбо ціск на свідравіне просяць дадаць. Узімку наогул важна ўважліва сачыць за ціскам і каб свідравіна не стала, бо ў кацельні не будзе падпорыі яна спыніцца, а гэта значыць, што так можна сістэму ацяпляльную размарозіць, трубы трэснуць і людзі без цяпла і гарачай вады застануцца; праўда пры Гене за ўвесь час такога не здаралася. Аднак не, было разок. Зламалася адна свідравіна, працавала на двух, пасля яшчэ адна стала, дзень працавала на адной, а пасля з-за моцнай нагрузкі і апошняя помпа згарэла, стала свідравіна; ціску няма – кацельня не працуе; а той ноччу, усіх сазвалі, Гену з Ракава прывезлі, аварыйка тут, МНС (Міністэрства па надзвычайных сітуацыях) таксама; карацей, пакуль свідравіны аднаўлялі, мянялі помпы, пажарныя вазілі ваду на сваіх машынах і пампавалі ў кацельню каб ціск нейкі быў. Мяняць помпу гэта як, ён жа глыбінны, на глыбіні метраў сто, а то і дзвесце прыкручаны да трубы, труба зборная з кавалкаў па дзесяць метраў; прыязджае кран, падымае на тросе дзесяць метраў, кусок адкручваецца і да наступнага падымаюць, адкручваецца, і так да помпы; узімку мяняць помпу гэта капец – вада вакол капае,

льецца, сам і ўсё ў лёдзе. Ёсць яшчэ ў Азярцы грамадская лазня, тамака можа кран сарвацца ці кацёл барахліць.

Было раз цікава ў лазні. У жаночы дзень сарвала кран, дакладней скруцілі яго, не могуць жа акуратна круціць, круцяць так, каб абавязкова гайку адкруціць, прэ вада. Гена ўжо пераапрануўся дадому ехаць і вось вызвалі, так і пайшоў у чыстым туды. А тут баб (жанчын) валам, яны, зразумела, у ручнікі пазагортваліся, але ўсё роўна нейкі хвалюючы момант для мужыка столькі баб адразу ў негліжэ, амаль. Пачаў гэты кран круціць, а ён не закручваецца паскуда ніяк, разьба сарваная зусім. Горача, мокра. І бабы стаяць глядзяць, большасць, шчыра кажучы, у гадах ужо, але былі і маладыя. Смяюцца, з падкавыркамі, ціпа, ці не баіцца Гена, калі столькі дзевак вакол, могуць з ім што-небудзь зрабіць, згвалтаваць напрыклад – і рагочуць. А жартачкі пякучай чым у мужыкоў – на тоўстую такую жанчыну гадоў пад пяцьдзесят (любіцельніца выпіць, павархыха з дзіцячага садку): "Валя, пакажи ты сантехнику сваи прэлести, пусть парадуецца, он такого не видал никагда", "Да ну ты што, ен как увидит такое, заикацца станет патом или вабшчэ прыступ его схватит". І ў рогат. Маладыя ціпа па прыколу адна з адной ручнікі здзіраюць і таксама заходзяцца з рогату. Гену-та гэтым надта не збянтэжыш, как гаварыцца, але і ён стаў троха смушчацца (пачаў паціху бянтэжыцца). Карацей, з гэтым кранам... Знайшоў там кавалак дроту, так сяк прыладзіў. Увесь змакрэлы, потны: як дадому ехаць такому, але нічога не зробіш, крыху абсох і паехаў у сырым, а ўжо восень была. Пасля па прыколу было ў Азярцы ўбачыць якую з тых баб, проста ў жыцці, такое адчуванне быццам ведаеш пра іх нешта большае.

*(Проекция фотографии, баня в Озерце; файл "photo_003.jpg".)*

З дзярмом, каналізацыяй, як ужо казалі, Гена капашыцца не любіў. Але бывала. Гэта што ў асноўным – забівае, засор. Анучы ўсялякія кідаюць, буйное нешта, яшчэ тлушчам забіць можа, асабліва калі холадна, адходы харчовыя змываюць, а тлушч пасля цвёрдым становіцца, белым, у камы збіваецца. Усе ведаюць, што нельга анучы кідаць у унітаз, а ўсё роўна кідаюць; часам цэлыя майкі даставалі, майткі часта, штаны, джынсы, шапка зімовая пыжыкавая аднойчы была, нават курткі цэлыя, кнігі, газеты, кардон, траву, бутэлькі пластыкавыя, брускі драўляныя, памперсы, гэтыя, бля, пастаянна, гандоны (прэзерватывы), раз неяк

нехта цэлае дзіцячае вядро укінуў – цэнтральную трубу цалкам забіла, яно як корак у бутэльцы стала. Калі труба забіта цалкам, то узровень сцёкавых водаў падымаецца і ў дамах можа праз верх унітаза пайсці, што і было неаднаразова – увесь дом у лайне тады.

Каб засор прабіць ёсць розныя інструменты. Калі дзе ў доме — бярэцца трос, такая доўгая спружына, метраў на дзесяць і болей, розныя ёсць, у ракавіну ці ўнітаз засоўваецца і пракручваецца на гадзіннікавай стрэлцы, на адным канцы ручка ёсць круціць, а на другім востры наканечнік; пракручваецца, штурхаецца, туды-сюды тузаецца. Пры больш складаным засоры, у цэнтральнай трубе – прабіваюць дротам тоўстым, намотаным на катушку, з наканечнікам-пікай на адным канцы і ручкай для кручэння на другім (гэтая ўся штука ў народзе называецца «шампалоўка). У цэнтральнай трубе праз калодзежы прабіваецца, то бок люкі з літарай «К» - гэта як раз каналізацыйныя калодзежы; люк адкрываецца, калі калодзеж напоўнены – спачатку адкачваюць мотапомпай (пераносная помпа, якая працуе на бензіне), тамака ідзе труба без верхняй часткі, уразрэз, у яе ўстаўляецца зверху трубка з выгібам пад сорак пяць градусаў, у трубку дрот і піхаеш. Але самае зручнае і эфектыўнае шлангам прабіваць; шлангі – гэта такія пруты роўныя таўшчынёй ад васьмі міліметраў і па два метры даўжынёй, на двух канцах кожнага ёсць мацаванне з пазамі-зашчэпкамі, шлангі збіраюцца да патрэбнай даўжыні гэтым мацаваннем; то бок запхнуў частку ў трубу, далучыў наступную штангу; яшчэ запхнуў – наступную; на першай штанзе наканечнік як страла, на апошняй – ручка. Увесь прыкол штанг у тым, што яны зроблены з нейкага супер матэрыялу, які лёгка гнецца, але потым цалкам выпростваецца і дужа трывалыя; штангі нядаўна з'явіліся, мужыкі казалі – гэта швейцарская распрацоўка, яны не танныя, за адну ажно баксаў восемдзесят. Бывае, што ўручную ніяк не прабіць, моцны засор, тады вызываюць «Гідрадынаміку» - гэта машына з аранжавай бочкай і шлангамі; цвёрды шланг засоўваецца ў трубу, на канцы яго насадка, якая распырсквае ваду наперад, у бакі і, галоўнае, назад, быццам ракета нейкая; вельмі моцны ціск падаецца і насадка за кошт гідрадынамічных сіл, ну як ракета, рухаецца наперад.

Самае хрэновае – гэта калі трэба «даваць нырца у дзярмо», у каналізацыю лезці. Гэта калі адстойнік, калодзеж поўны ці калі на КПС неабходна прачысціць датчыкі ўзроўню, рэзервуар, тады трэба лезці туды, як кажуць, па плечы. Апранаецца гумавы касцюм, ён цэльны, з рукавамі, па шыю, называецца КІХ (касцюм ізалюючы хімічны), і пайшоў у плаванне... Шчыра кажучы, Гена стараецца як мага гэтага

пазбегнуць, за ўсе гады разоў пяць-шэсць «ныраў», таму што гэта стрэс – па плечы ў лайне поўзаць, смурод-та які!

У асноўным Гена абслугоўвае цэнтральную сістэму, а ў жыльцоў калі толькі нешта тэрміновае , там ужо калі краны памяняць, разводку зрабіць, ракавіну паставіць – то гэта ўжо за асобную плату.

Увогуле , работа мокрая, брудная, смярдзючая і ў лайне плаваеш. У шафе Гены на працы тры камплекты «зменкі», таму што за дзень можаш разы два вымакнуць і ў што-небудзь смярдзючае выпацкацца.

Работу Гена ведае. Даўно працуе, вопыт ёсць і не дурны ён, з мазгамі. Супрацоўнікаў усіх ведае, хто, што, як - плёткі ж. У ЖКГ асаблівага складу людзі працуюць, ўзаемаадносіны акрэслены, жыццё, прыколы, тэмы. Гена – супрацоўнік ЖКГ і з гэтым ён звыкнуўся.

1.6

У жыцці Гены нічога такога асаблівага не было . Нарадзіўся ў Ракаве, вучыўся дзевяць класаў у школе, затым ПТВ №63 у Мінску (прафесійна-тэхнічнае вучылішча) на мантажніка санітарна-тэхнічных сістэм. У школе любіў біялогію і гісторыю Беларусі. Гісторыю, шчыра кажучы, і зараз не кепска ведае, калі што запытаюць. Акрамя таго ў яго ёсць хобі – з металашукальнікам па наваколлі Ракава паблукаць, пашукаць, пакапаць; веды па гісторыі і здольнасць чытаць мапы тут дапамагае. Шмат знаходзіў манет, зброю з другой, з першай сусветнай вайны, медальёны, нажы, медалі, манеты і каштоўныя знаходзіў, напрыклад часоў ВКЛ (Вялікага княства Літоўскага).Тупаеш так адзін, павольна, часам спыняешся, капаеш з азартам, калі нешта знайшлося.

У школе яшчэ хадзіў у гурток па народнаму рамяству, гэта: саломапляценне, разьба па дрэву, з жалеза каваць, усялякія карысныя рэчы ў дом рабіць; быў па працы у іх тутэйшы народны майстар. Асабліва Гене саломапляценне падабалася і выходзіла.

У ПТВ калі вучыўся, у інтэрнаце не жыў, дадому ездзіў, не так і далёка. У Ракаве свае хлопцы, кампанія, па выходным дыскатэкі. Тусілі, бухалі канешне, самагон, у карты на грошы, зелле палілі, на тюнінгавых жыгулях насіліся, з дзяўчатамі ціскаліся па начах, ну ўсё як звычайна, усё проста.

Як гэта часта бывае жонка ў Гены па залёту знайшлася. Жаніўся, пераехаў у Мінск, жонка – сталічная была; прыехала на лета да бабулі адпачыць, ну і тут п'яны Гена джэнтльменскім чынам паказаў што такое любоў. Жылі напачатку не сказаць што ладзячы, таму што ў яе цяжкі характар, таму што яна недавучаная дурная школьніца, таму што мама ў яе сапраўдная ідыётка, а бацька алкаш і таму ад гэтага ўсяго Гена пачаў піць кожны дзень. Але сына вельмі любіў і зараз любіць. Разышліся гадоў сем таму, ды і наогул не зразумела, як столькі часу трываў.

Адразу пасля разводу Гена на нервах кінуўся ва ўсе цяжкія. Моцна піў, куціў, з працы пайшоў, жыў весела ў Ракаве. І вось скончылася ўсё цюрагай. Скончыліся неяк грошы для забаў і ён з сябрамі ноччу разабралі плот на мехдвары (стаянка трактароў) тутэйшага СВК (сельскагаспадарчага вытворчага кааператыву), былы саўгас «Труд», і сперлі (скралі) трыста літраў саляркі (дызельнага паліва). Зразумела, што іх хутка знайшлі, бо хаваць яўныя доказы яны і не збіраліся, наступным вечарам ім ужо « справу шылі». Далі паўтары гады калоніі, адсядзеў год. УДВ (умоўна-датэрміновае вызваленне) за добрыя паводзіны і прэмію на рэспубліканскім конкурсе па дэкаратыўна – прыкладным мастацтве сярод зняволеных. Гена за кратамі аднавіў, працягнуў свае заняткі саломапляцення. Іншыя зняволеныя спачатку паскураліся ( адносіліся зняважліва) да яго за гэта, але пасля тутэйшы аўтарытэт стаў на яго бок, сказаўшы, што «справа гэта прыгожая, няхай».Кіраўніцтва ў турме заахвочвала ўсялякія тамака культурна-выхаваўчыя заняткі. Напрыканцы тэрміну Гену ўжо і на агульныя работы не бралі, толькі пляценнем і займаўся, усяму кіраўніцтву, усім паханам рабіў.

Пасля турмы Гена ўзяўся за розум, зусім кінуў піць, пачаў ужо трохі думаць, вярнуўся ў ЖКГ у Азярцы, узялі, таму што на такую працу дурных мала набярэцца; з былой (жонкай) спрабаваў сысціся, але яна цалкам на ўсю галаву ку-ку стала, а па маці яе так наогул дурка сумуе; з сынам сустракаецца, гуляе, аліменты своечасовае плаціць; займаецца саломапляценнем.

1.7

Вось менавіта з-за саломапляцення Гена ў Лондан і патрапіў.

Пасля калоніі стаў займацца больш рупліва. Знайшоў ў інтэрнэце форум на гэтую тэму ( рамесным работам, дэкаратыўна-прыкладному мастацтву), Гена кампутарам нармальна карыстаецца; форум расейскі, але тамака і беларусаў многа. Есць яшчэ ў Мінскім палацы дзяцей і моладзі секцыя, але туды ён пару разоў толькі схадзіў, тамака дзеці.

Карацей, там на форуме, саломапляценнем хто толькі не займаецца – ад сантэхнікаў да дэпутатаў, камунікуюць, фоткі сваіх работ адно аднаму скідваюць, адзнакі выносяць, крытыкуюць, парады, дзеляцца досведам, сакрэтамі і г.д. І неяк з'явілася там тэма, што можна паўдзельнічаць у міжнародным конкурсе дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, што ёсць намінацыя і па саломапляценню; і тамака ўжо ўдакладнялі, куды пасылаць фатаграфіі работ, раілі як правільна іх фоткаць; арганізатары конкурсу ў Англіі, у Лондане, тамака ж будзе і фінальная выстава з цырымоніяй праходзіць. Гена сфатаграфаваў і адаслаў сваю лепшую работу – гэта вялікая, з некалькіх частак работа, дзе ёсць мужчына і жанчына народнага выгляду, іх дзеці, ёсць буслы, хата, студня, кветкі, дрэвы-дубы, сонца, ёсць сабака, кот і ёсць зубр. Вось паслаў і нават пра гэта забыўся. А праз час на емэйл (электронная скрыня) прыйшло паведамленне, што яго запрашаюць на цырымонію, што яго работа ўвайшла ў лік прэтэндэнтаў ў намінацыі па саломапляценню, дарога, пражыванне цалкам за кошт прымаючага боку.

...

Здаецца, гэта фігня, абышто нейкае! Нейкія тамака сантэхнікі, нейкае тамака саломапляценне, што за зубры, конкурс, які Лондан?! Ніколі не можа такога быць, гэта нават смешна! У лепшым выпадку – гэта нейкія жартачкі... Але менавіта так і было, так атрымалася і так было насамрэч. Шчыра кажу, верце.

...

Запрасілі ў Лондан. Гэта было для Гены нечакана, мякка кажучы нечакана! За мяжой ён ніколі не быў, толькі ў Літве і то з бацькамі падчас Саюза і ў несвядомым узросце. А тут адразу – Англія, Лондан, Біг Бен, Шерлак Холмс, Каралева і усё такое... Не, неяк дужа знянацку.

Адразу хацеў адмовіцца: па-англельску ні гельмес, як там што знайсці, як балбатаць, за мяжой упершыню, далёка, неяк сцыкотна ўсё. Але

пераканалі маці з бацькам, што гэта ж раз у жізни такое мажа быць, ты што, ляци; і яшчэ выявілася, што там будуць рускамоўныя ўдзельнікі з Расіі ў іншых намінацыях, будзе гід, а ў аэрапорце сустрэнуць, плюс візу і дакументы памогуць зрабіць. Згадзіўся. І правільна зрабіў, не ўвесь час блін дзярмо нюхаць, мы таксама на нешта здатныя. Ляцець самалётам на пяць дзён, праз месяц – у красавіку.

1.8

І вось тут Гена пачаў нешта адчуваць... Сувязь нейкую. З Радзімай. Такое адчуванне ўзнікла, быццам тут усё кідаць трэба, усё застаецца тут, а ён ляціць невядома куды, у другое, незваротна. Розумам цяміць, што толькі ўсяго на пяць дзён, а ўсё роўна журба такая... І так яму ўсё гэта роднае блізкім стала, словам не сказаць якім блізкім, быццам дзіця ад маці адарваць. Здаецца, дарослы мужык, сур'ёзны, «сапраўдны», не смаркач – і такое слюнцяйства. Адзінае, нікому не казаў пра гэта; пра Лондан ён наогул толькі бацькам сказаў, а на працы напісаў на ўласны рахунак па сямейным абставінам. З-за гэтага адчування інакш на сваё жыццё паглядзеў, на ўсіх хто побач, на родных, на блізкіх, у нейкія рэчы пачаў ўглядацца, чаго, нават, раней не заўважаў, колькі часу прайшло, што было, як магло быць, як насамрэч усё гэта блізка; задумвацца пачаў... Лондан – гэта цікава, Гене цікава паглядзець, на самалёце паляцець, але калі шчыра, то ані нікуды не хочацца ляцець, і каб ужо сказалі, што не трэба, адмяняецца, мабыць, узрадаваўся б.

1.9

На самалёце, калі ўзлятаеш – вушы закладае, да спінкі сядзення прыціскае і галава кружыцца, крыху муціць, боўтае; а ногі чамусьці халоднымі становяцца.

Гена ляцеў на самалёце Боінг, пра гэта сказаў пілот, які павітаў усіх па радыё. «Дзень добры, шаноўнае спадарства, вас вітае камандзір карабля. Мы выконваем палёт па маршруце Мінск, аэрапорт Мінск-2 – Лондан, аэрапорт Гатвіт. Час палёту каля трох гадзін. Надвор'е ў Лондану харошае, плюс 10, невялікі дождж... Жадаю прыемнага палёту». Якое ж

яно харошае, калі дождж?... Паказалі як карыстацца ратавальнай камізэлькай і дзе яна знаходзіцца; на крэсле спераду напісана « лайф вест андер ёо сеат».

Сядзеў праў крэсла ад ілюмінатара, шкада, хацелася паглядзець. Крэсла было пасярэдзіне: справа – мужык нейкі, так і не зразумеў чужаземец ён ці наш, за ўвесь час палёту ён слова так і не сказаў, спаў, альбо заплюшчваўшы вочы музыку слухаў; злева дзяўчына, яна наша, падслухаў яе размову па тэлефоне перад узлётам, ляцела да сваякоў у Лондан, упершыню, яна хвалявалася моцна, відаць было.

Перад узлётам цукеркі давалі з этыкеткай «Белавіа», не пасароміўшыся, ўзяў тры, у кішэню.

Піў-піў-піў, высвеціліся лямпачкі «Прышпіліць рэмень» , самалёт вырульвае на ўзлётную паласу. Разганяецца, разганяецца, разганяецца – і адрываецца. Зямля даволі хутка аддаляецца; фігова відаць у ілюмінатар, але хоць нешта. Тут толькі над дрэвамі былі, а ўжо вось усё дробнае, цалкам гарызонт відаць. Аддаляецца, аддаляецца ўсё... Вось гэта ўсё, родная зямля, радзіма тут застаецца, а я лячу, улятаю, у душы шчэміць, яно тамака застаецца, а я адарваўся і ўлятаю. Камок ў горле, вочы на мокрым месцы.... Пасля ў аблокі ( тады трохі пахмурна было) ўлятаеш – імжа, а далей над воблакамі падымаешся і сонца, іскрава. Ляціш.

*(праекцыя фотак, у самалёце над воблакамі; файл “photo_004.jpg”.) ...*

Камандзір карабля: «Шаноўнае спадарства, гаворыць камандзір караблю. Палёт адбываецца ў штатным рэжыме, вышыня палёту дзесяць тысяч сто метраў, тэмпература за бортам мінус пяцьдзесят шэсць, зараз ляцім над Польшчай, будзем ляцець над Германіяй, Нідэрландамі, Паўночным морам... Надвор'е ў Лондане харошае, невялікі дождж».

Якое яно харошая, калі дождж?... Значыцца ўжо над Польшчай, значыцца з Беларусі ўжо вылецелі, абалдзець. Нешта Гену ўжо назад захацелася... Не будзь смаркачом – Лондан наперадзе! Але гэта пачуццё... аддаляешся, пакідаеш.

...

Потым неяк, пасля палёту Гена глядзеў на Дзень касманаўтыкі фільм дакументальны па целіку пра асваенне космасу. Гэта ж вось калі з дому з'язджаеш, альбо так вось на самалёце ў Англію ляціш, адчуваеш гэта пачуццё суму, настальгіі launch маментальнай, роднае месца пакідаеш, а касманаўты лётаюць... Звар'яцець – яны наогул ад Зямлі адрываюцца ў Космас. Добра, гэта зараз ужо ведаюць усе, што там і як, а Гагарын! Альбо вось амерыканцы на Месяц лятолі – амаль чатырыста тысяч кіламетраў! Улятаеш у Космас і Зямля маленькая такая становіцца, усю відаць адразу. З Месяца калі яна глядзелі – Зямля як невялікая паўсфера выглядае. Абалдзець.

*(Праекцыя фотак, здымак Зямлі, зроблены астранаўтамі Апалона-11 з Месяца; файл "photo_005.jpg".)*

...

На спінцы сядзення, што спераду, у кішэньцы часопісы ляжаць, можна пагартаць. Чытаў артыкль: «Спосабы захавання асабістай актыўнасці ад правадыра сусветнага пралетарыяту». Расклад дня Леніна: сем нуль нуль – пад'ём і сняданак; восем нуль нуль – чытанне свежых газет у працоўным кабінеце; з дзевяці да шаснаццаці – распараджэнні, пасяджэнні і іншыя «делишки» дзяржаўнай важнасці; з шаснаццаці да васемнаццаці і да позняй ночы – работа, чытанне, заняткі; чатыры-пяць гадзінаў на сон. ...Нялюдскі нейкі расклад, з ранку пажраць, а пасля толькі а чацвёртай абедаць, гэта ж галодным хадзіць, ды і вячэры няма...

*(Праекцыя фотак, помнік В. І. Леніну у Дома ўрада Рэспублікі Беларусь, горад Мінск; файл "photo_006.jpg".)*

У самалёце, аказваецца, кормяць; дарма так з ранку з запасам накідаўся (наеўся). Быццам бы і есці не хацеў, ды і ад хвалявання, перажывання тым больш не хочацца. Заўважыў, што некаторыя адмаўляюцца, напрыклад, мужык гэты справа сусед – рукой так паказаў, што не-не, не будзе. Але Гена вырашыў усё ж такі паесці, хер ведае калі яшчэ паесці

атрымаецца, калі ў Лондане карміць будуць, тым больш за ўсё аплачана. Не абы што давалі, гарачы абед: мяса з грэчкай і, ого, з чарнаслівам, агуркі свежыя, булачка, вафля «Витоша», гарбата, сок узяў ананасавы. З'еў усё, нават апетыт паявіўся, вафлю ў кішэню паклаў.

*(Праекцыя фотак, вафля "Витоша", якую далі ў самалёце; файл "photo_007.jpg".)*

....

Ляцяць. Сумнавата ўжо стала, тужліва. Вырашыў узгадаць што-небудзь вясёлае. Узгадаў прыкол, вершык, адзін «фальклярыст» на працы расказваў: «На небе месяц, нібы срака, і зоркі бачны дзе-нідзе, а пад кустом сярэ сабака і пар ідзе..., ідзе...., ідзе....». Гэ, смешны, так, прыкол.

...

Ляцелі доўга над морам, было панятна, што гэта мора, таму што ўсё сіняе, воблакаў не відаць. А потым зямля паказалася. Нават Гене зразумела, што гэта ні што іншае як Англія! Вось гэта да! Даляцеў. Прыўстаў трохі, у ілюмінатар глядзеў, цікава жа. Вось яно якое, усё іншае, Англія, вунь палі, дамы, вунь дарогі, машыны. Адсюль, нават, відаць, што іншае.

Селі. Англія пад нагамі зараз будзе. Афігець.

У аэрапорце каб не заблукаць пайшоў проста за тымі, з кім разам у самалёце ляцеў, з твару кагосьці запомніў. На кантролю, каб шмат не тлумачыць, сказаў «турыст», печатку паставілі і пайшоў, на выхадзе сустрэлі. Сустракаў прадстаўнік конкурсу, англічанін гадоў трыццаці, трымаў шыльду, дзе імя-прозвішча Гены, ну як звычайна, як у кіно. Прадстаўнік магчыма ведаў, што Гена ангельскай не валодае, шмат пытанняў не задаваў, так, усміхаўся і віншаваў з прыездам. Пайшоў на электрычку, цягнік. Англія, англічане, усё іншае. Абалдзець.

1.10

Пакуль ехаў у электрычцы, а пасля ў таксоўцы ад акна не адліпаў, цікава. Будынкі скрозь з цэглы, у цэлым старадаўнія, машыны шыварат

навыварат ездзяць, у сэнсе руль з другога боку, вакол на ангельскай размаўляюць і нічога не зразумець. Паветра нават быццам іншае.

Прадстаўнік прывёз у гатэль, аплаціў нумар, выплаціў сутачныя, то бок на прыватныя расходы і харчаванне грошы, растлумачыў (як атрымалася, на пальцах) што праз гадзіну, гэта значыцца а дванаццатай, на ресэпшыне ( тут на першым паверсе) Гену будзе чакаць рускамоўны гід.

Усё сучаснае – ад нумара ключ не даюць, проста картка, яе да ручкі дзвярэй прыкладаеш і замок адкрываецца. Нумар на дзесятым паверсе, невялікі, але ўсё акуратненька, чысценька, па-сучаснаму. Адзін пакой, тамака вялікі ложак, шафкі з палічкамі (чамусьці без дзвярэй), тэлевізар, адно крэсла, тэлефон, электрычны чайнік, душавая кабіна, прыбіральня.

Гена ўвесь час дзівіўся. Гэта ўсё яму давалася за вырабы з саломы, якіх ён ужо мільён зрабіў. І візу афармілі, і самалёт аплачаны, і гатэль круты (ён у звычайных гатэлях быў, тамака дзверы ключом адчыняюцца), і сутачныя калі ласка (дзвесце фунтаў) і гіда далі... І работу Гены жа даставяць яшчэ асобна, а яна крохкая і даволі масіўная: восемдзесят сантыметраў у даўжыню, пяцьдзесят у шырыню, у вышыню трыццаць недзе.

Дванаццаць, пайшоў на ресэпшн. Тут чакалі ўжо некалькі рускамоўных удзельнікаў, іх групу Гена адразу вылучыў, гэта відавочна, з Расіі тры, Украіны два, і рускамоўны гід. Ху-х хоць паразмаўляць можна, а то з самалёта быццам нямым сябе адчуваў, ангельская паўсюдна. Вырашалі спачатку перакусіць, а пасля прагуляцца па Лондану, наведаць выдатныя мясціны.

Біг Бэн, Вэстмінстэрскае абацтва, Парламент, «Лонданскае вока», Сабор Святога Паўла, Трафальгарская плошча, Нацыянальная галерэя, Пікадзілі, Таўэр, Таўэрскі мост, Букінгемскі палац, Гайд-Парк, Кэмдэн... Такі горад!

Быццам нерэальнае усё, незвычайна, па-іншаму, быццам кіно, ціпа кіно глядзіш дакументальнае па целіку. Гена не верыў ва ўсё гэта. Знакамітыя ўсе гэтыя месцы... Пра некаторыя ён чуў альбо па теліку бачыў, ці яшчэ са школы памятае, на ўроках англійскай малюнкі ў падручніку (а вось мову то дарма ленаваўся вучыць). Ёсць старыя будынкі – то цэгла з цвіллю, ёсць новыя – то са шкла вычварна, але ў асноўным вакол цэгла; двухпавярховыя аўтобусы чырвоныя, гэткія тэлефонныя будкі, таксі-кэбы; шмат людзей і турыстаў валам, куча

неграў; на кожным кроку кавярні, рэстараны, крамы розныя, усё цыркулюе, жыццё бурліць.

Гена, вядома, узяў з сабой фотаапарат, здымаў, але шчыра кажучы, не такі ўжо ён фатограф.

*(Праекцыя фотак, здымкі зробленыя Генам у Лондане і каментары да іх;; файлы "photo-london-1.jpg" - "photo-london-158.jpg" и файл "photo-london.docx".)*

1.11

Блукалі па Лондану дапазна. Заходзілі дарэчы ў паб, гэта накшталт піўной, піўны рэстаран. Карацей, англічане нажыраюцца (напіваюцца) вечарамі ня меней за нашых толькі нашы гарэлкай альбо віном-чарнілам, а гэтыя півам; гоман, крык, футбол, немудрагелістая закуска, піва ракой, нехта ўжо з-за стала не можа падняцца – так напіліся; алкашня паўсюды, карацей. Гена не п'е, таму «знакамітага англійскага» піва не смакаваў. Вячэралі ў італьянскім рэстаране, Гена не зусім быў рады вячэраць у рэстаране, думалася вылучаныя грошы зэканоміць, тым больш ён ніфіга не гурман у адносінах да яды.

У гатэлі, у нумары Гена пасля ляжаў доўга думаючы. Тут такая вычварнасць, усё крута, сучаснае, па-еўрапейску, здаецца і нейкая большая свабода адчуваецца ў людзях, дастатак відаць ёсць, то бок усё лепшае, жыццё лепшае, але ён бы тут не застаўся назаўсёды калі б прапанавалі, дома хоць неяк, а лепей, гэта ж дома, там роднае і зразумелае. Адзін дзень у Лондане, а ён ужо дадому захацеў – ці не прыдурак, смаркач.

Ды не у тым нават справа, што дома ўсё зразумела, усё ведаеш, мова – тамака ты быццам неяк частка цэлага, а тутака як кавалак далеплены. Башкой гэта не зразумееш, тут адчуваць трэба, Гена яшчэ як гэта адчуў. Нічога гэтага сучаснага, еўрапейскага не трэба яму відаць, ён любіць Ракаў, Беларусь, сына свайго, ЖКГ нават любіць, сваю працу.

Гена спаў моцна, яму снілася Радзіма.

1.12

Прачнуўся рана, па часу на тры гадзіны разніца. У акно сядзеў глядзеў на світанак. Вырашыў і ў душ схадзіць. Сантэхніка, вядома, харошая, якасная; а вада ў кране – нібы атрута, казлянём бля станеш ад такой вады, з той, што на іх свідравіне ў Азярцы, і побач не стаяла, яшчэ цывілізацыя называецца.

У Гены ў гатэлі аплачаны брэкфаст, то бок сняданак. А восьмай пайшоў снедаць. Файна – бяры колькі хочаш і што хочаш. Ён наеўся пра запас, нават з вялікім запасам. Яешня, фасоля, мяса смажанае, грыбы нейкія, сасіскі, хлеб, тосты, фасолю на дабаўку браў, тры круасаны з шакаладным маслам, ёгурт, груша, банан, сок, кава. Быццам з галоднага краю, як жлоб апошні, бля, але ж капітальна падсілкаваўся.

Пасля хадзіў у два музеі і сучасную галерэю, якую заснаваў цукровы прамысловец – Тэйт. У музеях сумна, у Тэйт акрамя карцін яшчэ куча ўсялякага барахла, ціпа сучаснае мастацтва, нават сумна.

Перад паказам работ, цырымоніяй было трохі вольнага часу. Гена ў нумары прасядзеў. Хутчэй бы ўсё скончылася....

1.13

Цырымонія праходзіла у вялікай галерэі, яркай і прасторнай. Усялякая дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, рамесныя работы, саломкі не многа, у Гены дакладна найлепшая работа па саломцы чым у іншых. Шмат людзей. Прайшоўся, прагледзеў; не, усё ж такі яго работа лепшая ў параўнанні з іншымі, у яго складаная кампазіцыя, скрупулёзны праца.

Пачалася цырымонія. Паказалі на экране ролікі ўсялякія, пра конкурс, якія краіны ўдзельнічаюць, пра тое, што такое, народнае, мастацтва важна, што фальклорам захаваецца народ, яго гісторыя. Пасля казалі, выходзілі з дакладамі людзі, але ніхалеры не дацяміць, на ангельскай, з пятага на дзесятае ўловіш нешта.

...

Пачалі аб'яўляць намінацыі, пасля пераможцаў у кожнай, прызы даваць. І тут абалдзець што! Называюць намінацыю па саломцы. Вэйвін оф став

( Гена ведаў як саломапляценне па-англійску, сказалі яму) і Гену на сцэну выклікаюць! Так, Гену. Афігець можна ад такога!

Гена не чакаў; выйшаў на сцэну, усе ў далоні пляскаюць, яму грамату ўручаюць і крышталёвую кветку (сімвал конкурсу). Сказаць жа нешта трэба; ад хвалявання Гена сябе не пракантраляваў, прамову сваю на трасянцы прабубніў «Спасиба за прыс, бальшое спасибо. Я очэнь рад такому и не ждал. Спасиба». І хутчэй са сцэны валіць. Ого-го, вось як; увесь змок, пот пацёк. Ахрэнець блядь, хаця бы папярэдзілі што лі, а то так і засохнуць можна з перапуду.

Яшчэ некалькі намінацый узнагародзілі. І вось гран-пры аб'яўляюць. І хто б вы думалі атрымаў гран-пры? Так, блядь, менавіта ён, Гена! Тут ужо не проста абалдзець, тут «язык да грудзей и слюни па бараде».

«Спасибо ещё раз за прис, за главны прис. Я очень рад, што мая работа настолько панравилась журы. Спасиба всем». Яшчэ адну грамату далі і букет з крышталёвых кветак (сімвал гран-пры конкурсу). Бурныя авацыі.

Далей там быў банкет. Унеслі шампанскае, віно, закускі розныя. Гена нічога не піў і не еў; «перабздеў», ды і рукі занятыя – так і хадзіў з дзвюма граматамі і кветкамі гэтымі шклянымі. Падыходзілі людзі, віншавалі, « Кінгратьюлейшнс!», «Поздравляю!»; фоткаліся з ім на фоне яго работы. З рускамоўнымі размаўляў мала, расказваў як саломцы вучыўся, якая Беларусь, што працуе рабочым; з іншаземцамі ўсміхаўся і галавой ківаў...

Сур'ёзная падзея адбылася і ўзрушанне для Гены.

1. 14

Пасля ўсяго, у нумары, доўга не мог заснуць, вядома, адразу столькі ўсяго. Гэта ж трэба, каб так выйшла, мабыць насамрэч ён крута пляце, раз ажно два прыза далі; акрамя таго падыходзіў адзін мужык сталы, сур'ёзны такі, у акулярах і з барадой, сказаў, што ведае хто можа даць вялікія грошы за гэтую яго работу, Гена пакінуў емэйл і нумар мабільнага.

Шчыра кажучы, зараз Гене, як ні дзіўна, яшчэ больш дадому захацелася. Таму што гэтыя перамогі, увесь гэты поспех быццам адсунуў яго далей ад радзімы, ціпа што такія перамены зараз адбыліся і жыццё ў яго моцна

зменіцца пасля, і вось ён ад мінулага адрываецца і далей некуды рухаецца. Карацей ўсялякая фігня блін у галаву лезе, але сумна да жудасці. Не,не! Не трэба гэтага ўсяго яму. Прызы гэтыя, перамогі, продажы, грошы – дадому трэба, каб усё як раней было. Ракаў-Мінск-Азярцо, бацькоўская хата, бульбу тамака садзіць скора трэба, сын, Беларусь, ЖКГ, прарывы рамантаваць, з электрыкам пад'язджаць да Малінаўкі, новую КПС асвойваць, з металашукальнікам цягацца, летам можна на Нарач зганяць, па-восені па грыбы схадзіць, зімой пасля лазні ў снег скакаць, на мотаблок назбіраць... Радзіма!

Яшчэ атрымоўваецца два дні вольных, адлятаць толькі паслязаўтра на світанку. Хутчэй бы...

Ледзь заснуў, прыснілася што ў Азярцы прарыў моцны, вельмі моцны, ажно слуп вады да неба; зямля ад націску трэскаецца і расколіна ўсё болей і болей, быццам бы і планета хутка раскалоцца можа.

1.15

З ранку зноў гулялі з гідам і другімі, наведвалі славутыя і знакавыя мясціны. Сёння Гена ўжо не фатаграфаваў, ды і не вельмі цікава зараз было. Хадзіў за ўсімі, назіраў. Зацікавіўся толькі, калі ўбачыў як тутэйшыя камунальныя службы ліквідуюць прарыў цеплатрасы (ішоў пар) на вуліцы. Разрэзалі асфальт акуратненька, раскапалі невялічкім экскаватарам вузкую траншэю, ну і круцяць тамака, калупаюць. Тэхніка файная, прасунутая, новая; спецвопратка таксама харошая, усе ў касках, хто рэжа – у акулярах і берушах, усе неабходныя інструменты ў іх ёсць; робяць не спяшаючыся; вакол агароджана; карацей прафесійна; напэўна і заробкі высокія. У іх у ЖКГ разводны ключ і кувалда, а зарплаты мізэрныя. Нічога там дома здаецца добрага няма, але ўсё ж... Заглядзеўся, ад групы адстаў, пахваляваўся-пабегаў, у незнаёмым горадзе та, пакуль іх знайшоў.

Увесь наступны дзень у нумары прасядзеў і нікуды не хадзіў. Сабраўся, склаўся і сядзеў – ці ў акно глядзеў, ці па телеку каналы гартаў. Херава процьма каналаў, усяго семсот трыццаць, праўда некаторыя гэта магчыма радыё, без карцінкі; па-рускі каналаў не было, быў адзін, расейскі магчыма - «Раша тудэй», гэта, здаецца, навіны, але і ён на англійскай. А пасля натрапіў на фільм - «Пяты элемент», ну гэты знакаміты, з Брюсам Уілісам, глядзеў яго, увесь паглядзеў, яго можна ўжо і без перакладу глядзець – сто разоў бачыў перакладзены. Для

Карбена Даласа Радзіма – гэта Зямля, і ён яе ратуе. Паветра, Вада, Зямля, Агонь і Каханне.

1.16

Вось нарэшце праходзіць Гена ў аэрапорце рэгістрацыю, дагляд. У дьюці-фрі нічога не набываў, баяўся на самалёт спазніцца, хаця яшчэ і час быў, вырашыў дома можна гэтыя грошы патраціць урэшце рэшт (тыя, што браў з сабой і зэканомленыя сутачныя). Знайшоў сваю пасадачную платформу і тамака ўжо чакаў, яшчэ недзе паўгадзіны да пасадкі. Тутака ўжо роднае пачалося адчувацца, таму што былі іншыя пасажыры і большасць беларусаў, ці рускіх, размаўлялі па-расейску, і два мужыка падшафе моцна на трасянцы весела балакалі. Хух, ну ўсё, хутка буду дома.

У самалёт садзіўся, ён Белавіа - «Здравствуйте» ад бортправадніцы, прыемна, сваё. І песня грае беларуская: «Прыязджайце, прыязджайце, прыязджайце да нас у Беларусь!Прыязджайце, прыязджайце, прыязджайце да нас у Беларусь!», такі прыпеў быў, Сябры, Ярмольнік гэта здаецца. Прыеду, прыеду, прылячу хутка вось нарэшце.

На гэты раз і ўзлятаць зусім не страшна і ляцець быццам нармальна. Кармілі тым жа як і тады, калі прылятаў, толькі тым разам былі свежыя агуркі, а зараз салёныя, маленькія такія, а так усё тое самае. Часопісы не гартаў, думаў проста і ў ілюмінатар глядзеў, на гэты раз сядзеў каля ілюмінатара.

Тры гадзіны павінны хутка прайсці.

2

2.1

І тут вось што адбылося. Не чакаў Гена ад сябе такога, ніяк не чакаў. Гена заснуў на нейкі час, вось зараз прачнуўся і зноў у ілюмінатар глядзіць. Цікава, дзе гэта зараз пралятаем, Беларусь хутка ці не, над воблакамі нават не зразумець, не відаць. І як раз у гэты момант камандзір карабля : «Шаноўнае спадарства, гаворыць камандзір карабля... Мы ўвайшлі на тэрыторыю Беларусі, зараз пралятаем над

Гродна, хутка будзем у Мінску. Надвор'е ў Мінску добрае, плюс сем, невялікая воблачнасць...»

О! Так яны ўжо ў Беларусі. Ён ужо дома! Радзіма!... А нарэшце, нават вантробамі адчуваеш, што над Беларуссю зараз, такое адчуванне ўзнікла.

У Гены пачалі дрыжэць вусны, мокнуць вочы, ён паціху шморгае носам... Гена плача... Плача ўсё мацнее, не можа стрымацца... Дарослы мужык, нефіг тут румзаць, досыць, супакойся... Плача, слёзы ліюцца, з носу капае, увесь раскіс. Радзіма. Радзіма! Беларусь... Радзіма. Блядь!... Трындец. Вось яно як.

... Рыдае ўжо прыметна, рукой слёзы выцерці спрабуе, смаркачы, носам гучна шморгае, усхліпвае... Радзіма. Вось яно як!

Суседка ўсё гэта бачыць, хоча дапамагчы, яна іншаземка: «Кен ай хелп ю? Ю філ бэд? Хав кэн ай хэлп?» Ноу, ноу, ай гуд, усё нармальна. Плача, не можа спыніцца. Іншаземка корпаецца ў сумцы, дастае сурвэткі, дае Гену. Дзякуй, сенкс. Ён прымушае сябе супакоіцца, выціраецца сурвэткамі, усё досыць, трэба супакоіцца, сорамна ж.

...

Селі нармальна.

...

Выходзіць з аэрапорту. Зноўку накаціла. Плача. Адышоў у бок, каб ніхто не бачыў. Стаіць, салодкія слёзы радасці. Радзіма!

## 2.2

Відаць, Гена моцна любіць Радзіму, і, мабыць, ён патрыёт. Гена задумаўся над гэтым, не дарма ж усё гэта адбылося, трэба пакумекаць. Ён доўга разважаў, глядзеў у інтэрнэце значэнне слоў Радзіма і Патрыятызм. Усё дакладна напісана, але гэта не пра Гену, не пра тое, асабліва «Патрыятызм» у Вікіпедыі не адпавядаў таму, які ён у яго. Карацей, неяк складана... Ды і наогул нафіг пра гэта ўсё думаць насамрэч. Гена проста любіць тое, што тут вакол яго, якім бы яно не было – гэта ягонае. І нічога іншага яму не трэба.

2.3

Гена падымаецца як звычайна без пятнаццаці шэсць. Маці яшчэ спіць, а бацька ўжо корпаецца на двары. Ідзе на вакзал, тамака ўсё тая ж укормленая і строгая жанчына-кандуктар ва ўвесь голас аб'яўляе прыбыццё аўтобуса і ўважліва правярае ва ўсіх квіткі. Едзе да Мінска, да Каменнай горкі. Пасля Малінаўка. Тамака чакае Рэно Дзмітрыя Леанідавіча, едуць моўчкі – як звычайна. Вось іх ЖРЭУ ў Азярцы, вітаецца з усімі, усё тыя ж твары, прыемна ўсіх бачыць, пагаварыць. Пакуль Гены не было, два прарыву адбылося, трэба рамантаваць, яшчэ КПС новая падзабілася, пачысціць. Сонечна сёння, надвор'е спакойнае, і цёпла ўжо, вясна ў красе. У Гены выдатны настрой. Такі выдатны, што любіць, здаецца, усіх на ўсім Свеце.

2.4

Гена жыве таксама як і да паездкі ў Лондан, толькі зараз ужо ведае, што любіць Радзіму.

2.5

Гена выконвае песню «Каліна» (Аляксандр Саладуха), выяўляецца, што ён яшчэ і някепска спявае. Калі вы беларус, то дакладна ведаеце гэтую песню, можна падпяваць, калі саромеецеся ўголас, то можна і пра сябе. Тэкст песні важны.

*(Гучыць песня «Каліна», выконвае Гена, запіс на дыктафон мабільнага тэлефона ў караоке-клубе, файл «Песня-Каліна.mp3»)*

Канец

Мінск, 2014

пераклад Вольгі Кавалеўскай

15ok@mail.ru